# Калейдаскоп

красавік 2023

**Школьная газета №8 (48)**

*"Наша мова для нас святая, бо яна нам ад Бога даная"*

*Ф. Багушэвіч*

## Мова – душа народа






# Паэты і пісьменнікі пра мову



## Прыказкі пра мову і слова

Сабака брэша – вецер вее.

Са свайго языка спусціш - на чужым не зловіш.

Слова сказаў - сякераю адсек.

Слова як птушка: выпусціў - не зловіш.

Словы – гужы, за сэрца цягнуць.

Слоў на мяшок, а спраў на вяршок.

Скажаш бабцы - як усёй грамадцы.

Усяму пачатак – родная мова.

Хто забыў сваіх продкаў - сябе губляе, хто забыў сваю мову - усё згубіў.

Хто пытае, той не блудзіць.

Язык да Кіева давядзе.

Язык не сцяг, а дружыну водзіць.

Языком гару зверне , а на працы месца не знойдзе.

Языком у Вільні, а галавой за печчу.

Язык у разумнага ў галаве, у дурня - на зубах.

Якая птушка, такі і галасок.

Як наша мова: дзе да ідзе, ідзі ды хадзі, а як маскоўская мова: бярэ ды дзярэ, ды чорт іх разбярэ, хто каго дзярэ.



# Народныя традыцыі

**Калейдаскоп**
**красавік 2023**

**Назва чацвёртага месяца года паходзіць ад слова “красавацъ”, бо ў ім з’яўляюцца першыя краскі-кветкі. Гэтаму адпавядае і другая назва, што сустракаецца ў старажытнай літаратуры, – «кветень». Яе выкарыстоўвае і першадрукар Францыск Скарына ў “Малой падарожнай кніжцы”. У старажытных славян чацвёрты месяц года яшчэ вядомы як «беразоль».**



У другім веснавым месяцы прырода яшчэ захоўвала сляды зімы: “Красавік чорны ў полі, а ў бары – белы”. Калі ж вясна здаралася ранняя, дрэвы пачыналі пакрывацца маладымі лісткамі, пасля чаго ўжо гром на зялёнае голле ўспрымаўся ў народзе як паказчык будучых поспехаў у жыцці і гаспадарцы. Пра гэта гаварылася і ў прыкмеце: “У красавіку грымоты – да цёплага года”. Сухі красавік абяцаў, што такі ж будзе і чэрвень, аднак ліпень за ім павінен прыйсці дажджлівы. Пчаляры прыглядаліся: раз не вылецелі ў красавіку пчолы – чакай халадоў, слоты. Красавік для земляроба – адказны час: падрыхтоўка насення і выбар аптымальнага дня першага ворыва. Надзейнай прыкметай гатоўнасці глебы з’яўлялася наступнае: сціскалі ў жмені невялікі яе камяк і з сілай разбівалі вобзем. Калі рассыпаўся – “засупоньвай хамут”. Пачалі жабы крактаць – выходзь у поле. Жаўрук зазвінеў – бяры саху ў рукі. Не без падстаў у народзе было прынята выязджаць у поле пасля першага грому: следам за ім усталёўваліся цёплыя пагодлівыя дні. А яшчэ казалі: што ў красавіку ўзнікне, у чэрвені-ліпені заквітнее, паспее, а ў жніўні ў засекі і свірны схаваецца, у доўгую зіму дашчэнту падбярэцца.

# Народныя традыцыі



**Прыкметы па днях месяца**

1. **Якое надвор'е 1 красавіка, такое і 1 кастрычніка.**
2. **Калі ноч цёплая, то вясна будзе дружная. Лічылася, што гэты дзень спрыяльны для пасадкі гароху.**
3. **Дабравешчанне без ластавак – халоднае лета. Якое Дабравешчанне, такі і Вялікдзень. Калі ў гэты дзень ішоў дождж, лічылася, што будзе багаты ўраджай грыбоў, а калі грымеў гром, то зародзяць арэхі. Па народных назіраннях, у гэты дзень прылятаі буслы.**
4. **У народзе казалі, што ў гэты дзень шчупак хвастом лёд разбівае, а кнігаўкі вярталіся з выраю.**
5. **Калі ў ясную ноч прыбывала вада, то лічылася, што суха будзе ў жніво на хлебнай ніве.**
6. **Калі ў гэты дзень крыгаход, то няма ні клёву, ні лову рыбакам.**
7. **Ціхі дзень абяцаў добры ўраджай яравых.**
8. **Дождж у гэты дзень – да добрай каліны.**
9. **Калі дзень ясны, то лета будзе цёплым. У гэты дзень пачыналі сеяць авёс.**
10. **Народ заўважыў, што ў гэты дзень мядзведзь выходзіць з бярлогі.**
11. **Дождж на Марка, дык зямля як шкварка.**
12. **Пачыналі сеяць капусту на расаду.**
13. **Расстаўлялі вуллі на пчальніках. Калі ў апошні дзень красавіка сонца ўзыдзе ясна – будзе сухое лета, а калі праз хмары – дажджлівае. Прыкмячалі: на які "хлеб" паляцела пчала першы раз з вулля, той і на зерне будзе багаты.**

**Народныя прыкметы**

***У красавіку грымот — цёплы будзе год.***
***Красавік сушыць, нічога з зямлі не рушыць.***
***У красавіку зямля грэе.***
***У красавіку дождж праходзіць, сонца грэе — тады ўсякі не збяднее.***
***Красавік сініць і дзьме, бабам цяпло нясе, а мужык пазірае ды галавою ківае.***



# Папулярызацыя беларускай мовы



**Гульня-віктарына «Кніга - крыніца ведаў»**

**6 красавіка** ў беларускі чацвер з мэтай папулярызацыі роднай мовы для вучняў **5 «Б» класа** прайшла **гульня-віктарына «Кніга - крыніца ведаў»**. Вучні даведаліся пра гісторыю стварэння кніг, пра кнігадрукаванне, пра першых асветнікаў. Удзельнікі разгадвалі крыжаванкі, рэбусы, вызначалі імёны пісьменнікаў па прапанаваных радках, адгадвалі загадкі, тлумачылі значэнні цікавых слоў.

**Настаўнік беларускай мовы і літаратуры Юрчанка С.А.**






# Гістарычныя факты

**Калейдаскоп**
**красавік 2023**

## 80 год прайшло з часу трагедыі ў вёсцы Хатынь,
## калі ўсе жыхары былі спалены…



## 5 красавіка 80 год з дня нараджэння Мар’яна Duксы




**Мар’ян Мікалаевіч Дукса** (5 красавіка 1943, в. Каракулічы, цяпер Мядзельскі раён, Мінская вобласць — 19 красавіка 2019) — беларускі празаік і паэт.

Мар’ян Дукса нарадзіўся ў 1943 годзе ў вёсцы Каракулічы, цяпер Мядзельскі раён, Мінская вобласць. Рана страціў бацьку. У 1958—1960 гг. займаўся ў Свірскім вучылішчы механізацыі сельскай гаспадаркі, закончыўшы яго, працаваў у калгасе ўлікоўцам трактарнай брыгады, адначасова вучыўся завочна ў сярэдняй школе. У 1969 годзе скончыў філалагічны факультэт БДУ. З 1969 па 1987 год працаваў настаўнікам сярэдняй школы ў Солах.

На старонках рэспубліканскай перыёдыкі выступае з вершамі з 1960 года. Выдаў вершаваныя зборнікі «Спатканне» (1967), «Крокі» (1972), «Станцыя» (1974), «Прыгаршчы суніц» (1976), «Забытыя словы» (1979), «Зона супраціўлення» (1982), «Твая пара сяўбы» (1985), «Заснежаныя ягады» (1989), «Горн прымірэння» (1993). Аўтар кніг для дзяцей «Зялёны акварыум» (1980) і «Світаюць сосны» (1987).

Прыгажосць Бацькаўшчыны, роднай прыроды, паэзія кахання, праблемы дабра і зла, веры — асноўныя матывы яго твораў.

## 18 красавіка 120 год з дня нараджэння Платона Галавача



**18 красавіка 1903 года нарадзіўся Платон Галавач** — беларускі пісьменнік і дзяржаўны дзеяч, член літаратурнага аб'яднання «Маладняк».

Радзімай яго з'яўляецца вёска Пабокавічы Бабруйскага раёна Магілёўскай вобласці. Бацькі былі малазямельныя і непісьменныя сяляне. Платону не было і двух гадоў, калі памерла маці. Хлопец з маленства дапамагаў бацьку па гаспадарцы, з 7 гадоў наймаўся за пастуха.

П. Галавач горача ўспрыняў тыя падзеі, якія адбываліся ў грамадскім жыцці. У 1920 г. уступіў у камсамол, узначаліў камсамольскую ячэйку ў роднай вёсцы. У 1922 г. павятовы камітэт накіраваў яго на вучобу ў Мінскую партыйную школу, пасля якой ён працаваў інструктарам. А ў 1923 г. стаў членам КП(б)Б.

У 1926 г. скончыў Камуністычны ўніверсітэт Беларусі ў Мінску і стаў працаваць загадчыкам аддзела ЦК ЛКСМБ, з 1928 г. — першым сакратаром ЦК ЛКСМБ і рэдактарам газеты «Чырвоная змена».

Адзін з кіраўнікоў літаратурных арганізацый «Маладняк», БелАПП.

З лістапада 1929 да сакавіка 1930 г. — намеснік наркома асветы БССР. У розны час рэдагаваў часопісы «Маладняк», «Полымя». Абіраўся членам ЦК КПБ і ЦВК БССР.

У 1937 г. рэпрэсіраваны. Рэабілітаваны ў 1956 г.

# Юбілейныя даты



## 18 красавіка 120 год з дня нараджэння Платона Галавача




*Выданні з фондаў Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка*

Спрабаваць свае сілы ў літаратуры Платон Галавач пачаў у 1920 г. З нататкамі на камсамольскія тэмы выступаў у бабруйскай газеце «Юны камуніст», рэдактарам якой была Вера Харужая. Першае апавяданне («Загубленае жыццё») было апублікавана ў газеце «Савецкая Беларусь» у 1925 г. У 1927 г. выйшла першая кніга яго апавяданняў «Дробязі жыцця». Потым былі зборнікі «Хочацца жыць» (1930) і «Апавяданні» (1934); аповесці «Вінаваты» (1930), «Спалох на загонах» (1930; перавыд. у 1996), «Даляры» (1931), «Носьбіты нянавісці» (1936, час. «Полымя рэвалюцыі»), «Яны не пройдуць» (1937, час. «Полымя рэвалюцыі»); нарыс «Ад Мядзвежай гары да Белага мора» (1934); раман «Праз гады» (1935; перавыд. у 1936, 1984, 1992). У 1958 г. выйшаў «Збор твораў» у трох тамах.

# Літаратурная старонка



## Красавік

**У жыццё, як раней, улюбёны**
**Я адкінуў зімы чарнавік,**
**Бо вярбы новай сукняй зялёнай**
**У вакно заглянуў красавік.**
**Уварваўся ён ветрам у хату**
**І вакно да сцяны адчыніў,**
**Нагадаў мне адразу пра тату,**
**Ён апошнім ў жыцці яго быў…**
**Ён прынёс і другую мне звестку,**
**Што вясна пераможа зіму,**
**Як у попел агонь спаліць трэску,**
**Я, канешне, паверыў яму.**
**Красавік – уздыхнуць гэтак вольна,**
**Хіба ў маі мажліва яшчэ.**
**Не спяшайся, прашу, хай павольна**
**Водар твой ў маю душу цячэ.**
**А на неба паціху выходзіць,**
**Як цытрыны шматок, маладзік.**
**Што ён робіць са мной, што ён робіць,**
**Гэты дзіўны хлапчук-красавік.**

**Уладзімір Гардзейка**



## Красавік

Ці ведаеце вы, чаму ў Красавіку так хораша і столькі красак?

Ды таму, што Красавік — мастак. Быў час, калі Красавік самы першы раз прыйшоў на зямлю. І не спадабалася яму пасля зімы пажоўклая трава, шэрае неба, чорная зямля… І рашыў ён усё-ўсё перафарбаваць.

Узяў Красавік фарбы і пэндзаль і перш-наперш памаляваў неба ў сіні-сіні колер, а на ім белыя-бялюткія аблокі. Затым перамаляваў палі.

Дзе зялёнай, дзе жаўтаватай, дзе шэрай фарбай мазнуў. Лугі вымаляваў у ясна-зялёны колер, а па тых лугах-мурагах давай пырскаць то блакітнай, то жоўтай, то белай, то ружовай фарбамі…

І якіх толькі красачак не з’явілася на лузе! Аж у вачах мільгаціць.

— Ну, а цяпер падамся ў лясы, — сказаў Красавік, — гляну, што там трэба падмаляваць.

І падаўся ў лес.

— Эгэ-гэ-гэ! — загукаў ён. — Сосны, яліны! Вольхі, асіны! Дубы, ясені! Ліпы, клёны, бярозы! Усе, хто зможа, ідзіце да мяне!

І пайшлі да Красавіка дрэвы, а ён каму чырвоны камель намалюе, каму жаўтаваты, каму карычневы, шэры, чорны, срабрысты… Амаль усе фарбы вымаляваў, аж стаміўся. А тут прыбегла да яго Бярэзінка, задыхалася, ледзь стаіць з апушчаным веццем.

Глянуў Красавік, а ў яго ўсяго толькі адна белая фарба асталася.

— Будзеш белаю, — кажа Бярэзінцы.

— Няхай белаю, толькі не чорнаю… Не хачу быць чорнаю!

А да гэтага Бяроза чорнаю была.

Пачаў Красавік маляваць Бярозу ў белы колер, але фарбы не хапіла, дык сям-там чорныя лапікі асталіся.

Адышоўся, глянуў на сваю работу: стаіць сярод чырвоных сосен ды шэрых ялін белая-бялюткая Бярозка, нібы тая дзяўчынка ў белай сукеначцы.

І такая яна стала прыгожая, што Красавік ажно засмяяўся. Адклаў ён убок свае фарбы і пэндзаль, выразаў з вербалозу дудку, сеў пад Бярозаю ды зайграў.

І так прыгожа, што ў Бярозы аж слёзы пакаціліся.

І цяпер, бывае, вясною сядзіць Красавік пад бярозкаю і грае на дудачцы. Пайдзіце ў вясновы лес, прыслухайцеся, можа, і сустрэнецеся з Красавіком. І на Бярэзінку паглядзіце… Стаіць яна, апусціўшы вецце, слухае песню Красавіка, і часам капне на зямлю празрыстая бярозавая слязінка.

Але бярозавыя слёзы не салёныя, а салодкія, бо плача яна не ад гора, а з радасці.

*Клаўдзія Каліна*

# Цікава ведаць



## Вялікдзень

Вялікдзень - вялікае гадавое веснавое свята. Ім некалі адкрываўся новы каляндарны год.

З прыняццем хрысціянства гэтае свята атрымала духоўны сэнс і ачышчальную моц, з’яўляецца выключна радасным і ўрачыстым у шэрагу ўсіх хрысціянскіх святаў. Падрыхтаваўшыся духоўна Вялікім сямітыднёвым постам, на перадвялікодным Белым тыдні пачынаюць рыхтавацца да правядзеньня святочных дзён. У Чысты Чацвер чысцяць і прыбіраюць хату і двор. У Вялікую Суботу, напапярэдадні Вялікадня, гатуецца, варыцца, смажыцца мноства розных страваў. Пякуцца пірагі, фарбуюцца ў розныя колеры і распісваюцца ўзорамі курыныя яйкі (пісанкі). Увечары гэтага ж дня прыбіраюцца ў святочную вопратку, бяруць з сабой падрыхтаваную для асвячэння "пасху", ідуць у царкву на ўсяночную службу.

Пасля Літургіі святкаванне працягваецца дома. Любімая гульня ў моладзі — біткі. Стукаюцца святочнымі яйкамі, і пераможцам аказваецца той, у каго яно застаецца цэлае.

У першы велікодны вечар на Беларусі былі пашыраныя валачобныя абыходы, падчас якіх групы валачобнікаў хадзілі па хатах і выконвалі валачобныя песні з пажаданнем селяніну плёну на ніве, прыплоду ў статку, добрага здароўя, шчаслівае долі, велічалі гаспадароў і руплівую працу.

У вялікодны абрадавы комплекс уваходзілі рытуальныя трапезы, карагоды і памінанне памерлых родзічаў - веснавыя дзяды Радаўніца.

Гэтае свята не мае пэўнай, пастаяннай прымеркаванасці ў народным календары: у залежнасці ад месячнага календара яно прыпадае на час ад 4 красавіка да 8 мая.

Урачыстасць Вялікадня тлумачыцца і яго рэлігійным зместам. У адпаведнасці з хрысціянскімі ўяўленнямі, гэтае свята праслаўляе цудадзейнае ўваскрасенне Ісуса Хрыста, які быў пакараны распяццем на крыжы.

Гэтай падзеі – цудоўнаму вяртанню да жыцця Ісуса Хрыста – і прысвечаны разнастайныя хрысціянскія звычаі і абрады на Вялікдзень. Не выпадкова, што і вітацца ў гэты дзень прынята словамі: “Хрыстос уваскрэс!”



# Цікава ведаць

Калейдаскоп
красавік 2023

## Вялікдзень

Пасля асвячэння пасхі ў царкве кожны гаспадар імкнуўся як мага хутчэй бегчы з ёю дадому. Гэты звычай быў заснаваны на народным павер'і: хто першы прыбяжыць з пасхаю дамоў, у таго будзе лепшы ўраджай, і той гаспадар першы скончыць палявыя работы. Абрус, на якім стаялі велікодныя стравы, захоўваўся ў недатыкальнасці на працягу ўсяго года: ен, згодна з народнымі вераваннямі, ахоўвае ад граду, і таму пры з'яўленні градавых хмар гэты абрус расцілалі на двары.

У цэнтры велікоднай абраднасці знаходзіцца яе своеасаблівы сімвал – пафарбаванае яйка. Паводле хрысціянскіх уяўленняў, велікоднае яйка сімвалізуе перамогу жыцця над смерцю, а яго чырвоны колер нагадвае аб крыві Хрыста, якая была праліта дзеля выратавання людзей. Асвечанае ў царкве яйка елі першым пасля вяртання з усяночнай службы, пачынаючы святочнае застолле.

У першы дзень Вялікадня лічылася неабходным мыцца вадою, у якую пакладзены залатыя і срэбныя рэчы, а таксама чырвонае велікоднае яйка, каб увесь год быць багатым, чыстым і прыгожым, як яйка. Маці гладзілі чырвоным яйкам, якое вымалі з вады, на твары сваіх дзяцей, каб яны былі заўседы румянымі і чырванашчокімі. Фарбаваныя велікодныя яйкі і зараз дараць родным і знаемым. Абмен такімі яйкамі-падарункамі паміж хлопцамі і дзяўчатамі азначае іх прызнанне ва ўзаемным каханні. Важнае значэнне мела велікоднае яйка, атрыманае ў каго-небудзь першым: верылі, што яно не псуецца на працягу ўсяго года і мае цудадзейную сілу. Велікодныя яйкі клалі ў зерне, прызначанае для сяўбы.

З велікоднага тыдня пачынаюцца летнія гулянні, ваджэнне карагодаў і закліканне вясны. На другі і трэці дзень Вялікадня па вёсках хадзілі валачобнікі – велікодныя спевакі – славельшчыкі. Валачобнікі абыходзілі ўсе хаты ў весцы і перад кожнай хатай спявалі, услаўляючы гаспадара, членаў яго сям'і, жадалі плённай працы, добрага ўраджаю, прыплоду жывелы. У адказ гаспадары дзяквалі валачобнікам і давалі ім падарунак – валачобнае (фарбаваныя яйкі, каўбасы, сыр).

*Гаспадар ты наш з гаспадыняю,*
*Не тамі нас доўга, падары нас борздка*
*Не вялікім скарбам, чырвоным яйком.*

У апошні дзень свята (а ў некаторых раёнах у першы ці другі) беларусы хадзілі на могілкі памянуць ("пахрыстосавацца") сваіх продкаў.



**Рэдактар Юрчанка С.А.**